УДК 069.6:378.147(476)БГУКИ

***І. І. Бамбешка,***
*кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

# ПАДРЫХТОЎКА СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ДЛЯ МУЗЕЙНАЙ СФЕРЫ Ў ВНУ: АЙЧЫННЫ ВОПЫТ І ЯГО РЭАЛІЗАЦЫЯ ВА ЎСТАНОВЕ АДУКАЦЫІ «БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ»

**Анатацыя.** Разлядаюцца пытанні эвалюцыі і зместу падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны на тэрыторыі Беларусі. Важнымі вехамі ў гэтым працэсе былі стварэнне Віцебскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута, а таксама краязнаўчыя курсы ў 1927–1928 гг., адкрыццё кафедры крыніцазнаўства і музеязнаўства пры Беларускім дзяржаўным універсітэце (1992). Увага надаецца вопыту ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».

**Ключавыя словы:** музей, музеязнаўства, музейная прафесія, падрыхтоўка спецыялістаў у галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

***I. Bambeshka,***
*PhD in Culturology, Associate Professor of the Department of Historical and Cultural Heritage of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts"*

# TRAINING OF SPECIALISTS FOR THE MUSEUM SPHERE AT UNIVERSITIES: DOMESTIC EXPERIENCE AND ITS IMPLEMENTATION IN THE EDUCATIONAL INSTITUTION "BELARUSIAN STATE UNIVERSITY OF CULTURE AND ARTS"

**Abstract.** The article deals with the evolution and content of the training of specialists in the field of museum work and protection of historical and cultural heritage in Belarus. Important milestones in this process were the creation of the Vitebsk branch of the Moscow Archaeological Institute, local history courses in 1927/1928, the opening of the Department of Source Studies and Museum Studies at BSU in 1992. The author pays attention to the experience of the Belarusian State University of Culture and Arts.

**Keywords**: museum, museology, museum profession, training of specialists in the field of museum work and protection of historical and cultural heritage.

Паяўленне і станаўленне падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне музейнай справы ў сістэме вышэйшай адукацыі з'яўляецца вынікам тых змен, якія адбываліся пры фарміраванні музейнай навукі. Так, упершыню патрэба ў адпаведных спецыялістах была асэнсавана ў канцы XIX – пачатку XX ст. Першы адукацыйны цэнтр па падрыхтоўцы спецыялістаў для музеяў у Еўропе – «Школа Луўра» – створаны ў 1882 г. [1]. У Маскве ў Археалагічным інстытуце (МАІ) у 1907 г. пачаў чытацца спецыяльны курс «Уводзіны ў музеязнаўства» (аўтар – С. К. Кузняцоў). Запатрабаванасць спецыялістаў у галіне мастацтвазнаўства, архівазнаўства, археаграфіі і сумежных дысцыплін у Расійскай імперыі абумовіла стварэнне аддзяленняў названага інстытута ў шэрагу яе гарадоў (Варонежы, Калузе, Ніжнім Ноўгарадзе, Растове, Смаленску, Яраслаўлі), у тым ліку і ў Віцебску (1911). У Віцебскім аддзяленні МАІ вялася падрыхтоўка па спецыяльнасцях «вучоны архівіст», «вучоны археолаг» і «вучоны мастацтвазнаўца». Вядомы беларускі гісторык, архівіст і археограф М. Ф. Шумейка адзначае, што праграма падрыхтоўкі спецыялістаў у гэтай навучальнай установе істотна не адрознівалася ад цэнтральнага ВНУ і іншых філіялаў, але была скарэкціравана з улікам беларускай спецыфікі [17]. І якраз «Музеязнаўства», якое выкладалася ў іншых філіялах, у планах Віцебскага аддзялення МАІ не было [14]. Разам з тым падчас падрыхтоўкі артыкула да нас трапілі і іншыя звесткі, праўда, без спасылак на адпаведныя крыніцы. Нягледзячы на адсутнасць «Музеязнаўства» сярод выкладаемых дысцыплін, многія з выпускнікоў узгаданай установы ў далейшым мелі непасрэднае дачыненне да музейнай справы Беларусі: М. М. Багародскі, І. П. Фурман, К. А. Змігродскі, І. І. Васілевіч і інш.

З асаблівай вастрынёй праблема падрыхтоўкі музейных кадраў паўстала пасля 1917 г., што было абумоўлена значным ростам колькасці музеяў (асабліва ў правінцыі), эміграцыяй пэўнай часткі музейных супрацоўнікаў, а ў далейшым – масавым адхіленнем ад музейнай дзейнасці асоб нелаяльных да савецкай ідэалогіі. Такая сітуацыя ў пэўнай ступені характэрна і для БССР, дзе ў 1920-я гг. створана значная колькасць музеяў. Таму пытанне аб падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў для музеяў неаднаразова абмяркоўвалася і кіраўніцтвам музеяў, і вышэйшымі органамі ўлады. Так, на пасяджэннях музейнай рады

Беларускага дзяржаўнага музея (БДМ) неаднаразова адзначалася неабходнасць наладжання падрыхтоўкі музейных спецыялістаў, краязнаўцаў-музеязнаўцаў, у прыватнасці, «шляхам утварэння інстытуту практыкантаў пры БДМ» [12, арк. 290].

Першы айчынны вопыт выкладання музеязнаўства ў сістэме вышэйшай школы звязаны з 6-тыднёвымі краязнаўчымі курсамі («курсы-студыі»), якія арганізавалі ў 1927/28 навучальным годзе пры Беларускім дзяржаўным універсітэце (БДУ) і дзейнічалі вясной 1928 г. Названыя курсы прызначаліся для студэнтаў, школьнікаў, настаўнікаў. Праграма ўключала пытанні гісторыі і методыкі краязнаўства, арганізацыі краязнаўчай справы, бібліяграфіі і музейнага будаўніцтва. Заняткі праводзілі прафесары БДУ, прадстаўнікі ЦБК, супрацоўнікі Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі, Беларускага дзяржаўнага музея (А. М. Ляўданскі, В. Ю. Ластоўскі) [2, с. 85; 5, с. 83]. Сярод іншых дысцыплін слухачам прапаноўваўся курс лекцый «Музеязнаўства і музеябудаўніцтва», які чытаў тагачасны дырэктар БДМ В. Ю. Ластоўскі. Тэматычны план і змест дысцыпліны, калі ён нават быў падрыхтаваны, пакуль не выяўлены, таму можна толькі здагадвацца, аб чым гаварыў В. Ю. Ластоўскі. Улічваючы, што ён быў адным з аўтараў новага Статута БДМ, падрыхтаваў праект рэарганізацыі музейнай сеткі БССР, выступіў з прапановай унесці змены ў існуючую ў БДМ сістэму ўліку музейных прадметаў, распрацаваў інструкцыю для краязнаўчых музеяў па зборы этнаграфічных матэрыялаў, падрыхтаваў некалькі артыкулаў гісторыка-музеязнаўчага зместу, а таксама яго ўласны калекцыянерскі і музейны вопыт, то можна думаць, што змест заняткаў В. Ю. Ластоўскага вызначаўся менавіта гэтай праблематыкай [6; 9, с. 50; 10; 11; 12, арк. 288–289; 13].

Аднак, нягледзячы на значную патрэбу ў музеязнаўчых і іншых краязнаўчых ведах, курсы праіснавалі непрацяглы перыяд.

Да пазначанай праблемы зноў звярнуліся ў пачатку 1930-х гг. На Усебеларускай нарадзе музейных работнікаў у лютым 1932 г. было вырашана правесці перападрыхтоўку 25–30 музейных супрацоўнікаў праз сістэму арганізацыі кароткатэрміновых курсаў. Планавалася з 1 кастрычніка 1932 г. пры Магілёўскім палітасветтэхнікуме адкрыць музейнае аддзяленне для падрыхтоўкі працаўнікоў сярэдняй кваліфікацыі. Пастанова ЦК КП(б)Б патрабавала арганізаваць музейную спецыялізацыю

ў БДУ і ВПШ [8; 15, с. 85]. Тым не менш сістэма падрыхтоўкі музейных кадраў так і не была створана.

Па розных прычынах сацыяльна-палітычнага характару традыцыя прафесійнай падрыхтоўкі музейшчыкаў у сістэме ВНУ на доўгія гады была перарвана. З канца 1920-х гг. і да пачатаку 1990-х гг. у музеі прыходзілі працаваць асобы з агульнагуманітарнай адукацыяй: гісторыкі, філолагі, педагогі. Гэта садзейнічала развіццю профільных музейных дысцыплін, але не спрыяла фарміраванню музейнай навукі.

Сітуацыя некалькі змянілася толькі ў канцы 1980-х гг., калі загадам Міністра вышэйшай і сярэдняй адукацыі БССР ад 26 чэрвеня 1986 г. быў зацверджаны план адбору асоб карэннага насельніцтва БССР для накіравання на навучанне ў ВНУ іншых саюзных рэспублік у парадку пазаконкурснага прыёму на 1 курс на 1986–1990-я гг. У акрэслены перыяд для навучання ў Маскоўскі гісторыка-архіўны інстытут былі накіраваны 9 чалавек [7, с. 7]. Але і такая практыка не вырашала праблемы для музеяў.

У пэўным сэнсе спрыяльнымі фактарамі для развіцця музея як сацыяльнага інстытута наогул і музейнай адукацыі ў прыватнасці з’явіліся падзеі канца 1980-х – пачатку 1990-х гг.: абвяшчэнне незалежнасці Беларусі, прыняцце Закона аб мовах, лібералізацыя грамадска-палітычнага жыцця садзейнічалі росту нацыянальнай самасвядомасці, што праявілася ва ўзмацненні цікавасці да гісторыка-культурнай спадчыны, актывізацыі музейнай грамадскасці і інш. Менавіта ў такіх умовах з 1 верасня 1992 г. рашэннем Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь на базе гістарычнага факультэта БДУ адкрыта аддзяленне архівазнаўства і музеязнаўства з дзённай і завочнай формамі навучання. Для рэалізацыі падрыхтоўкі названых спецыялістаў 27 чэрвеня 1992 г. рашэннем рэктарата БДУ створана кафедра крыніцазнаўства і музеязнаўства пад кіраўніцтвам доктара гістарычных навук, прафесара У. Н. Сідарцова [16, с. 184]. Праграма для навучання будучых музейных супрацоўнікаў будавалася на тых жа прынцыпах, што і ў Расійскім дзяржаўным гуманітарным універсітэце: на першых двух курсах студэнты атрымоўвалі грунтоўныя веды па агульнагістарычных і спецыяльных гістарычных дысцыплінах, а пачынаючы з трэцяга курса, – паглыбленую спецыялізацыю па асноўных напрамках работы музеяў, а таксама па мастацтвазнаўстве, тэорыі і гісто-

рыі культуры. Практычнаму знаёмству з рознымі кірункамі музейна-спецыфічнай работы садзейнічалі вучэбная і вытворчая практыкі, якія праходзілі ў вядучых музеях рэспублікі. Па заканчэнні студэнты першых выпускаў атрымалі спецыяльнасць «музеёлаг. Арганізатар музейнай справы». У канцы 1990-х гг., пасля ўвядзення ў праграму курсаў педагагічнага цыкла дадаліся яшчэ адзін напрамак і адпаведная кваліфікацыя – «выкладчык гісторыі». Развіццё ў пачатку 2000-х гг. турыстычнай сферы патрабавала стварэння яшчэ аднаго напрамку – культурная спадчына і турызм (кваліфікацыя «менеджар па культурнай спадчыне і турызму») з увядзеннем адпаведных дысцыплін. Павялічылася ў сувязі з гэтым і колькасць вытворчых практык – да іх далучыліся яшчэ і педагагічная, турыстычная менеджарская. Традыцыі, закладзеныя на кафедры крыніцазнаўства і музеялогіі, працягвае створаная ў 2001 г. кафедра этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў, якая з’яўляецца галоўнай для астатніх, адкрытых пазней, што працуюць на аснове падрыхтаваных і апрабаваных у БДУ дзяржаўных стандартаў і вучэбных планаў.

У другой палове 1990-х гг. у краіне праводзілася рэарганізацыя вучэбна-адукацыйнага працэсу. У 1997 г. прыступілі да праектавання дзяржаўных адукацыйных стандартаў спецыяльнасцей вышэйшай адукацыі. Першы стандарт, прыняты ў 1998 г., акрэсліў асноўныя патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі музейных спецыялістаў [4].

З 1994 г. спецыялістаў у сферы музейнай справы і аховы помнікаў пачалі рыхтаваць у Беларускім універсітэце культуры (сёння БДУКМ) на кафедры этналогіі і музеязнаўства, якая праз пэўны час была аб’яднана з кафедрай гісторыі, якую ўзначаліў вядомы гісторык А. П. Грыцкевіч. Кафедра аб’яднала не толькі вядомых гісторыкаў (А. П. Грыцкевіч, М. А. Бяспалая, А. І. Смолік), этнографаў і фалькларыстаў (В. С. Цітоў, В. К. Цішчанка, Т. М. Мікуліч), археолагаў і гісторыкаў архітэктуры (А. А. Трусаў), але і музейных практыкаў, якія былі запрошаны для выкладання спецыфічных музейных дысцыплін (супрацоўнікі Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі (сёння Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь), Дзяржаўнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Заслаўе» і іншых музеяў сталіцы).

За 30 гадоў існавання спецыяльнасці ў названым універсітэце змянілася некалькі адукацыйных стандартаў і вучэбных планаў. Тыпавыя вучэбныя планы, якія распрацоўваюцца ў БДУ, БДУКМ, адаптаваліся з улікам спецыфікі і навучальнай установы, і прафесарска-выкладчыкага складу кафедры, патрабаванняў, што выказваюцца музейшчыкамі-практыкамі. Традыцыйна, значны аб’ём гадзін быў адведзены на сусветную гісторыю і гісторыю Беларусі, спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны і крыніцазнаўства, гістарычнае краязнаўства і этналогію і этнаграфію Беларусі, археалогію, замежныя мовы (у тым ліку лацінскую, польскую, англійскую і інш.) і інш. Дысцыпліны напрамку спецыяльнасці прадстаўлены музеямі замежных краін, аховай гісторыка-культурнай спадчыны, гісторыяй музейнай справы, тэорыяй і методыкай музейнай справы. Канкрэтызацыя апошняй адбывалася пры выкладанні музейнай педагогікі, навукова-фондавай работы музеяў, менеджменту і маркетынгу музейнай справы, якія адпавядалі асноўным кірункам музейнай дзейнасці і інш. Для пашырэння кругагляду нашых студэнтаў, іх прафесійных магчымасцей, канкурэнтаздольнасці ў параўнанні з выпускнікамі іншых ВНУ па адпаведнай спецыяльнасці ў розныя часы на кафедры выкладаліся такія вучэбныя дысцыпліны, як «Сцэнічная мова» і «Сцэнарнарэжысёрскія асновы культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў» і інш. Паяўленне названых дысцыплін абумоўлена патрэбамі часу, актыўным уключэннем рэгіянальных музеяў, кадравыя патрэбы якіх у асноўным забяспечвала кафедра, у сацыякультурную прастору горада і рэгіёна [3, с. 160].

Важнай складаючай падрыхтоўкі спецыяліста ў галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны з’яўляліся азнаямляльныя, вучэбныя і вытворчыя практыкі: археолагаэтнаграфічная, фондавая, экскурсійная і менеджарская, якія праводзяцца ў розных музеях Мінска. Надзвычай станоўча ўплывае на прафесійнае станаўленне будучых музейных супрацоўнікаў арганізацыя экскурсій па музеях, помніках і памятных мясцінах розных рэгіёнаў рэспублікі, кантакты з музеямі не толькі сістэмы Міністэрства культуры, але і іншых устаноў і ведамстваў. Падобная практыка, цесная сувязь з рэгіянальнымі музеямі, актыўнае развіццё турыстычнай сферы абумовіла адкрыццё ў 2012 г. напрамку «Гісторыка-культурная спадчына і

турызм» для падрыхтоўкі спецыялістаў у межах той жа спецыяльнасці.

Яшчэ ў пачатку 2000-х гг. для падрыхтоўкі навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі ў галіне музейнай справы, а таксама кансервацыі і рэстаўрацыі гісторыка-культурных аб'ектаў на кафедры адкрылі магістратуру і аспірантуру. Першая абарона кандыдацкай дысертацыі па названай спецыяльнасці на саісканне вучонай ступені кандыдата культуралогіі адбылася ў 2009 г.

Неабходна дадаць, што, акрамя БДУ і БДУКМ, падрыхтоўка спецыялістаў у галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны ажыццяўляецца таксама на гістарычным факультэце Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны. Пэўны час спецыялістаў у акрэсленай сферы рыхтавалі ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава і Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы.

Падводзячы вынікі, можна адзначыць, што, пачынаючы з 1990-х гг., у розных вышэйшых навучальных установах Беларусі ў значнай колькасці адкрываюцца музейныя спецыяльнасці. Шматузроўневая сістэма падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны наладжана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў.

1. *Ананьев, В. Г.* История зарубежной музеологии: идеи, люди, институты / В. Г. Ананьев. – М., 2018. – С. 214.

2. *Аніхоўскі, А.* Праца Таварыства Краязнаўства пры Беларускім Дзяржаўным Унівэрсітэце ў 1927–1928 гг. / А. Аніхоўскі, В. Невядомскі // Наш край. – 1928. – № 6–7. – С. 79–86.

3. *Беспалая, М. А.* Музеология в контексте проблем вузовского образования: опыт Беларуси / М. А. Беспалая // Вопросы музеологии. – 2012. – № 2 (6). – С. 156–161.

4. *Бярэйшык, Л. У.* Падрыхтоўка музейных спецыялістаў на гістарычным факультэце БДУ / Л. У. Бярэйшык // Музей і культурная спадчына: гісторыя, сучаснасць, погляд у будучыню : да 25-годдзя адкрыцця спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» (па напрамках) на гіст. фак. БДУ : зб. матэрыялаў Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 27–28 чэрв. 2017 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. А. Гужалоўскі [і інш.]. – Мінск, 2017. – URL: https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/184077/1/Музей%20і%20культурная%20спадчына.%20гістор

ыя%2С%20сучаснасць%2С%20погляд%20у%20будучыню.pdf (дата звароту: 18.12.2023).

*5. Вайтовіч, А. У.* «Краязнаўчае ўра»: дзейнасць краязнаўчага таварыства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта паводле матэрыялаў газеты «Савецкая Беларусь» / А. У. Вайтовіч // Першы Рэспубліканскі краязнаўчы форум Беларусі ў рамках Года малой радзімы : зборнік матэрыялаў : у 2 т. / уклад.: П. М. Сапоцька, Ю. В. Юшкевіч ; рэдкал.: А. М. Карлюкевіч (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2020. – Т. 1. – С. 80–85.

*6. Власт. [Ластоўскі, В.]* Інструкцыя для зьбіраньня рэчаў у этнографічныя аддзелы музэяў / Власт. [Ластоўскі, В.] // Наш край. – 1927. – № 8–9. – С. 66–73.

*7. Глинка, В. С.* Подготовка специалистов по архивоведению и музееведению в Беларуси во второй половине 80-х – 90-е гг. XX века / В. С. Глинка // Вестник Брестского государственного технического университета. – 2005. – № 6. – С. 7–10.

*8. Гужалоўскі, А. А.* Музеі Беларусі (1918–1941) / А. А. Гужалоўскі. – Мінск, 2002. – С. 143.

*9.* II Ўсебеларуская Краязнаўчая Конфэрэнцыя. 7–12 студзеня 1929 г. // Наш край. – 1929. – № 1. – С. 49–72.

*10. Ластоўскі, В.* Беларускі Дзяржаўны Музей / В. Ластоўскі // Наш край. – 1927. – № 10. – С. 47–52.

*11. Ластоўскі, В.* Белорусский государственный музей / В. Ластоўскі // Белорусская культура. Сборник I. – Минск, 1928. – С. 49–54.

*12.* Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 1927. Цыркуляр СНК БССР, выпіскі з пратаколаў пасяджэнняў прэзідыума і сакратарыята Інбелкульта і перапіска з Бабруйскім, Віцебскім, Слуцкім акрана аб ахове гістарычных помнікаў, аб становішчы музейнай справы. Арк. 288–290.

*13.* Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 1935. Матэрыялы аб рабоце Беларускага дзяржаўнага музея і яго філіялаў у гор. Гомелі, Віцебску, Магілёве (рэзалюцыі, пратаколы, статуты і інш.). Арк. 1, 100.

*14.* Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 249. Воп. 2. Спр. 162. Асабістая справа Мялешкі Міхаіла Вікенцьевіча. Арк. 27.

*15.* Пастанова № 58 Колегіі Народнага Камісарыяту Асьветы БССР ад 11/IV -32 г. // Савецкая краіна. – 1932. – № 4. – С. 84–85.

*16. Сидорцов, В. Н.* На переломе: к 30-летию кафедры источниковедения исторического факультета Белорусского государственного университета / В. Н. Сидорцов // Пічэтаўскія чытанні – 2022: універсітэты і архівы як састаўныя элементы экалогіі культуры : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 30 верас. 2022 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; навук. рэд. М. Ф. Шумейка, А. А. Яноўскі ; рэдкал.: А. Г. Каханоўскі (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2022. – С. 180–188.

17. *Шумейко, М. Ф.* Подготовка историков-архивистов в Беларуси: история и современность / М. Ф. Шумейко // Архівознавство. Археографія. Джерелознавство: Міжвідомчий наук. зб. – Вип. 5: Архіви – складова інформаційних ресурсів суспільства / Державний Комітет архівів України. Український науково-дослідний інститут архівної справи та документознавства ; Інститут історії НАН України ; Інститут української археографії та джерелознавства ім. М. С. Грушевського НАН України ; Національна бібліотека України ім. В. І. Вернадського ; Інститут рукопису ; Інститут біографістики ; Київський Національний університет ім. Тараса Шевченка ; Київський Національний університет культури і мистецтв. – Київ, 2002. – URL: http://www. archives.gov.ua/Publicat/Researches/Materialyconfer_04.php.#Shumeyko (дата звароту: 11.11.2023).

УДК 784.96:378.147

***Н. В. Баранова,***
*старший преподаватель кафедры хоровой музыки*
*учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*

# ФОРМИРОВАНИЕ У СТУДЕНТОВ ХОРОВОЙ СПЕЦИАЛИЗАЦИИ ПРОФЕССИОНАЛЬНЫХ ИСПОЛНИТЕЛЬСКИХ КОМПЕТЕНЦИЙ ПОСРЕДСТВОМ ИЗУЧЕНИЯ ФОРТЕПИАННЫХ ПОЛИФОНИЧЕСКИХ ПРОИЗВЕДЕНИЙ

**Аннотация.** Рассматриваются основные компоненты формирования профессиональных исполнительских компетенций у студентов хоровой специализации в процессе изучения фортепианных полифонических произведений. В качестве компонентов успешного возникновения профессиональных исполнительских компетенций рассмотрены и проанализированы следующие: мотивационный, когнитивный (познавательно-интеллектуальный), практический, оценочный, художественно-творческий. Большую роль в процессе создания профессиональных исполнительских компетенций автор видит в изучении и интерпретации фортепианных полифонических произведений как особой творческо-интеллектуальной основы музыкального искусства.

**Ключевые слова:** профессиональные исполнительские компетенции, компетентностный подход, мотивационный компонент, когнитивный (познавательно-интеллектуальный) компонент, практический компонент, оценочный компонент, художественно-творческий компонент, полифоническая фактура, художественно-исполнительские задачи, интерпретация.